*А.А.Суша*

# АКУПАЦЫЙНЫЯ ЎЛАДЫ І ХРЫСЦІЯНСКІЯ ЦЭРКВЫ

Сёння даволі складана адназначна ахарактарызаваць палітыку нямецкіх акупацыйных улад у дачыненні да хрысціянскіх цэркваў Беларусі. З аднаго боку, немцы стымулявалі развіццё рэлігійнага жыцця на занятых тэрыторыях. А з другога – яны праводзілі рэпрэсіўныя дзеянні супраць вернікаў, святароў, царкоўных іерархаў, знішчалі храмы і іх унутранае ўбранства. Нямала фактаў, якія пацвярджаюць гэта.

Праводзячы генацыд і рабаванне мясцовага насельніцтва, акупацыйныя ўлады выпрацавалі даволі складаную і супярэчлівую палітыку ў адносінах да канфесій. Паводле меркавання даследчыка М.Шкароўскага, гэтая палітыка не мела дакладнага выражэння, хутчэй зводзілася да спроб стварэння новай рэлігіі на аснове ідэалогіі нацызму і “выпраўленага”, “дэіудаізаванага” хрысціянства [1].

На акупіраваных землях нямецкія ўлады не перашкаджалі адкрыццю храмаў (асабліва праваслаўных), якія былі закрыты Саветамі. Часам іх прадстаўнікі нават прысутнічалі пры адкрыцці цэркваў, пра што паведамлялася ў друку. Апрача аднаўлення храмаў, што існавалі раней, у некаторых месцах будаваліся новыя. У выніку на пачатак 1945 г. колькасць цэркваў у Беларусі дасягнула 1044, па іншых звестках – 1093. Была арганізавана работа па падрыхтоўцы і пасвячэнні новых святароў. За перыяд з 1941 г. па 1945 г. у Беларусі ў сан было пасвечана 213 чалавек [2, с. 219–220]. Пасля доўгіх гадоў панавання "ваяўнічых бязбожнікаў", знішчэння храмаў падобныя дзеянні не маглі не выклікаць радасці ў мясцовага насельніцтва. У выніку вялікая колькасць вернікаў звярталася з просьбамі і заявамі аб адкрыцці тых ці іншых святыняў. Аднак нельга лічыць, што нямецкія ўлады кіраваліся выключна патрэбамі грамадства, задавальняючы гэтыя просьбы і заявы. Галоўнай прычынай было папулісцкае жаданне заваяваць давер насельніцтва, гэта з аднаго боку, а з другога, стымуляваць непрыязнасць да савецкай "бязбожнай" улады.

Нярэдка дзеянні па штучным распаўсюджанні рэлігійнасці сярод насельніцтва намецкіх ўлад не мелі логікі. Так, напрыклад, сурова забаранялася працаваць па нядзелях. Парушальнікі дадзенага загаду падвяргаліся штрафам і нават расстрэльваліся. Насельніцтву прадпісвалася ўсе рэлігійныя святы адзначаць па старым стылі, у кожным доме мець іконы, насіць на шыі крыжыкі, хрысціцца перад і пасля прыняцця ежы. Усе раней здзейсненыя грамадзянскія акты аб'яўляліся несапраўднымі. Гэта ў першую чаргу тычылася рэгістрацыі дзяцей, вянчання, смерці. Насельніцтва абавязвалася праводзіць іх па рэлігійных абрадах [2, с. 216–217].

Для большага паслаблення сувязей насельніцтва захопленых тэрыторый з астатняй часткай Савецкага Саюза, для паслаблення ўплыву Масквы на беларускія землі акупацыйныя ўлады спрабуюць аднавіць папулярную ў 20-я гг. XX ст., але не здзейсненую ідэю аўтаноміі беларускай праваслаўнай царквы, незалежнай ад Маскоўскай патрыярхіі. Неабходнай умовай рэлігійнага жыцця станавілася беларуская мова. Святары павінны былі быць беларусамі. Нават калі дапусціць, што патрэба аўтакефаліі беларускай праваслаўнай царквы мела аб'ектыўны характар і ішла з царкоўнага асяроддзя, то рэ-

алізацыя гэтай патрэбы адбывалася ў форме дырэктыў, загадаў, што паступалі зверху ад нямецкіх улад.

Спроба стварэння ў другі раз беларускай аўтакефальнай царквы ў складаных умовах вайны лажылася на плечы 74-гадовага архіепіскапа Панцеляймона і епіскапа Бенедыкта, якія на пачатак вайны заставаліся пражываць у Жыровічах. Яшчэ ў 20-я гг. Панцеляймон не падтрымаў ідэю стварэння праваслаўнай аўтакефальнай царквы ў Польшчы, за што доўгія гады знаходзіўся на пакоі ў Жыровічах. Ён і зараз не жадаў аддзялення беларускай царквы ад Маскоўскай патрыярхіі (як і епіскап Бенедыкт). За сваю настойлівасць на Саборы епіскапаў (сакавік 1942 г.) Панцеляймон 2 чэрвеня 1942 г. быў адхілены нямецкімі ўладамі ад кіравання царкоўнымі справамі і адпраўлены ў былы манастыр у Лядах Смалявіцкага раёна, пасля перавезены ў Вілейку, дзе і жыў пад наглядам нямецкай ваеннай паліцыі, пакуль яму не дазволілі вярнуцца ў Мінск. Гэта было ужо пасля правядзення Усебеларускага царкоўнага сабора, які абвясціў пра ўтварэнне Беларускай аўтакефальнай праваслаўнай царквы. Таму асноўная праца па правядзенні Сабора праводзілася пад кіраўніцтвам епіскапа Філафея, таксама значна абмежаванага ўладамі ў правах [2, с. 217–219; 3, с. 89–116].

Можна прывесці намала прыкладаў, калі царкоўнаслужыцелі актыўна працавалі на немцаў. Некаторыя рэпрэсіўныя акцыі (адпраўка людзей на работы ў Германію, агрэсіўная агітацыя і здача немцам партызан) праводзіліся пры іх непасрэдным удзеле. Але большасць святароў у перыяд нямецкай акупацыі станавілася на шлях барацьбы з фашыстамі, нярэдка ахвяруючы сваім жыццём. Вядома шмат выпадкаў, калі святары, ахвяруючы сваім жыццём, дапамагалі партызанам, выратоўвалі грамадзян ад выгнання ў Германію або расстрэлу незалежна ад іх веравызнання і нацыянальнасці. Фашысты, не вагаючыся, знішчалі святароў, спальвалі храмы (часам з вернікамі), як толькі даведваліся пра сувязі вернікаў прыхода з партызанамі. Часам партызаны або прапольскія дзеячы правакавалі немцаў на ліквідацыю святароў, асабліва прыхільнікаў аўтакефаліі. Знішчалі немцы святароў яўрэйскага паходжання [2, с. 219–221; 3, с. 89–116].

Адносіны акупацыйных улад да рымска-каталіцкай канфесіі былі, можна сказаць, варожымі, таму што яны разгля-

ве як пятую калону польскага нацыянальнага руху на гэ-
эрыторыі. Ужо ў першыя дні гітлераўскай агрэсіі была
едзена ліквідацыя шэрага каталіцкіх святароў. Пасля
наўлення акупацыйнага рэжыму ў Беларусі пачаліся ма-
ія рэпрэсіі [4, с. 140–141]. Прыбыўшыя на ўсход палякі-
дзы атрымалі ад немцаў загад спыніць сваю дзейнасць і
ацць туды, адкуль яны прыбылі. Аднак ксяндзы не падпа-
аваліся і працавалі далей у парафіях. Яны былі арышта-
ія нямецкімі ўладамі і расстраляныя. Такі самы лёс на-
аў наступныя групы палякаў-ксяндзоў, камандзіраваных
Усходнюю Беларусь. Нягледзячы на гэта, аж да 1944 г.
ўсё роўна прысылаліся з Польшчы. Шматлікія арышты і
йствы ксяндзоў прывялі да таго, што касцёлы заставаліся
душпастыраў. Была закрыта Духоўная семінарыя, арыш-
ны прафесары тэалагічнага факультэта, а таксама
клірыкаў, 50 з якіх вывезены на работы ў Германію. Пад
рэсіі трапілі насельнікі мужчынскіх і жаночых манасты-
[3, с. 137; 4, с. 142–143]. Частка Гродзеншчыны адышла ў
д Усходняй Прусіі, а Брэстчыны – у рэйхскамісарыят
аіны. Гэта звужала магчымасці католікоў. А, як вядома,
авіта на заходніх тэрыторыях Беларусі каталіцтва было
ыш распаўсюджаным. Адраджэнне каталіцкага жыцця
ымлівалася адсутнасцю цэнтра кіравання касцёламі. Ня-
кія ўлады забаранілі здольнаму на гэта біскупу
ілёўскаму і мінскаму Б.Слоскану займацца
іністрацыйнай дзейнасцю на тэрыторыі Беларусі. Гэтую
ю пачаў выконваць вядомы каталіцкі дзеяч, доктар тэа-
ії С.Глякоўскі. Шмат зрабіў для актывізацыі каталіцкага
цця вядомы прыхільнік беларусізацыі касцёла ксёндз
Гадлеўскі. Аднак пашырэнне ўплыву каталіцтва выклікала
адавальненне ў рускіх праваслаўных вернікаў. Пачалі
ўляцца даносы з абвінавачваннямі ў польскасці, а за імі –
страэлы. Трагічна абарвалася жыццё згаданых
Глякоўскага, В.Гадлеўскага і іншых каталіцкіх святароў.
домыя і шматлікія гераічныя ахвяраванні жыццём бела-
скіх ксяндзоў і манахаў. Шмат святароў загінулі ў час кар-
х акцый супраць мірнага насельніцтва ці былі замучаны ў
герах смерці [5]. Некаторыя прадстаўнікі рымска-
таліцкага духавенства супрацоўнічалі з партызанамі,
шыя – з немцамі або з Арміяй Краёвай.

Пасля акупацыі Беларусі фашысцкімі захопнікамі прымаюцца крокі па актывізацыі дзейнасці уніяцкіх абшчын. У пачатку 1942 г. экзархат уніяцкай царквы на чале з А.Неманцэвічам выходзіць з падполля і дабіваецца ад акупацыйных улад яго афіцыйнага прызнання, што было не да спадобы некаторым колам, у тым ліку і мітрапаліту Панцеляймону. У жнівеньскую ноч 1942 г. у Альберцінскім манастыры гестапа арыштоўвае А.Неманцэвіча. Праз пэўны час след гэтага таленавітага чалавека губляецца. Пасля арышту А.Неманцэвіча Альберцінскі манастыр быў разагнаны, парафія ліквідавана, а намеснік экзарха айцец Л.Гарошка вымушаны быў заняцца педагагічнай працай, а пасля эміграваць [3, с. 138].

Значна павялічылася за гады вайны колькасць пратэстанцкіх суполак. Адны з іх падтрымлівалі нямецкія ўлады, як, напрыклад, суполка ЕХБ у Ваўкавыску. Былі і адваротныя выпадкі. У в.Шаломі Другія Слаўгарадскага раёна ўсе вернікі адмовіліся карыстацца нямецкімі пашпартамі. Тады да іх прымянілі рэпрэсіі, па чарзе выводзілі са строю і прапаноўвалі ўзяць гэты дакумент. За адмову расплачваліся жыццём. Немцы расстралялі 32 чалавекі [2, с. 230].

Такім чынам, можна адзначыць, што дачыненні нямецкіх акупацыйных ўладаў у Беларусі і хрысціянскіх цэркваў мелі даволі складаны характар. Яны складваліся пераважна не па тыпу супрацоўніцтва і раўнапраўя, а пры непасрэдных спробах аднаго боку падпарадкаваць другі. Акупанты імкнуліся па магчымасці поўна ахапіць сваім кантролем усе сферы рэлігійнага жыцця на занятых тэрыторыях. Пры наяўнасці нейкіх супярэчнасцей яны свабодна выкарыстоўвалі рэпрэсіўныя сродкі. У сваю чаргу, савецкія органы пасля сканчэння вайны выкарыстоўвалі тыя самыя сродкі супраць святароў, вернікаў і саміх прыходаў, што былі створаныя на акупіраванай тэрыторыі.

---


1. *Шкаровский М.В.* Нацистская Германия и православная церковь. – М.: Изд-во Крутиц. патриаршего подворья: О-во любителей церков. истории, 2002; *Ён жа.* Русская православная церковь при Сталине и Хрущеве. – М.: Изд-во Крутиц. патриаршего подворья: О-во любителей церков. истории, 2000.

2. *Канфесіі* на Беларусі (канец XVIII–XX ст.) / Навук. рэд. У.І.Навіцкі. – Мн.: Экаперспектыва, 1998.
3. *Касяк І.* З гісторыі праваслаўнай царквы беларускага народа. – Нью-Йорк: Выд. Бел. цэнтр. Рады, 1956.
4. *Ярмусик Э.С.* Католический костел в Белоруссии в годы второй мировой войны (1939–1945). – Гродно: ГрГУ, 2002.
5. *Няхай* сведчанне іх веры на забудзецца: лёс каталіцкага касцёла ў Беларусі ў 1917–1953 гг. / Юбіл. канф. каталіц. біскупаў Беларусі. Каміс. па справах Новых Мучанікаў. – Непакаланаў, 2000. – С. 22–27.